## КАЛЕКТЫВУ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ БЕЛАРУСІ

Сардэчна віншую ўсіх работнікаў і шматлікіх чытачоў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі з 75-годдзем з дня яе заснавання.

Прыемна адзначыць, што ў галоўнай бібліятэцы рэспублікі прытрымліваюцца лепшых традыцый па зберажэнню каштоўных кніжных фондаў, развіццю асветніцкай, навуковай і інфармацыйнай дзейнасці. Да яе духоўных скарбаў звяртаюцца мільёны чытачоў, яе добра ведаюць і цэняць не толькі ў Беларусі, але і за мяжой.

Нацыянальная бібліятэка Беларусі з'яўляецца захавальніцай ведаў, культуры і навуковай памяці многіх пакаленняў вучоных і пісьменнікаў. Уся яе дзейнасць накіравана на эканамічнае і духоўнае развіццё беларускага грамадства. Значная роля належыць Нацыянальнай бібліятэцы як навукова-даследчаму і метадычнаму цэнтру ў галіне бібліятэказнаўства, бібліяграфіі і гісторыі кнігі.

Выказваю шчырыя словы падзякі тым, хто сваёй самаадданай працай спрыяў і спрые развіццю бібліятэчнай справы краіны.

Жадаю ўсім вам моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту, а таксама новых поспехаў у выкананні вашай высакароднай місіі ў імя далейшага росквіту нашай Бацькаўшчыны.

**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

*24 кастрычніка 1997 года.*